чэрвень 2019

# Тэкст дыктанта для правядзення ўступных іспытаў у VIII клас ДАУ “Мінскае абласное кадэцкае вучылішча”

## Адзенне нашых продкаў

З даўніх часоў да нас дайшлі рэшткі тканін з льну, пянькі, шоўку, а таксама галаўных убораў, абутку.

Асноўным прадметам жаночага і мужчынскага касцюма была кашуля. Яна мела то круглы, то чатырохвугольны, то косы выраз. Выраз аздабляўся вышыўкай ніткамі, пацеркамі або тасьмой. Кашулі са стаячымі каўнярамі зашпільваліся гузікамі, завязваліся шнуркамі. Верхнім адзеннем былі наплечныя пакрывалы, кажухі, шубы.

Значную ролю адыгрываў пояс з тканіны, скуры ці нітак. Яго насілі з металічнымі спражкамі

Адзенне знаці шылася з дарагіх прывазных тканін і упрыгожвалася вышыўкай залатымі ніцямі і каштоўнымі камянямі. Фарбы для тканін атрымлівалі з раслін і дрэў. Выкарыстоўваліся і мінеральныя фарбавальнікі.

*(100 слоў).*

*Паводле Л. Дучыц*